Ліна Кастэнка



...дэмакратыя тым і добрая,
што пры дэмакратыі не дзяржава
разбурае чалавека, а чалавек будуе дзяржаву...

# Гуманітарная аўра нацыі,

***альбо Дэфект галоўнага люстэрка***

*Пераклаў з украінскай – Міхась СКОБЛА.*

Вось жа, *гуманітарная аўра нацыі*. Ці ня праўда, нейкае прыемнае для слыху спалучэньне словаў? Сапраўды, кожная нацыя павінна мець сваю гуманітарную аўру. То бок комплекс навук, якія натужліва эмануюць і ахапляюць усе сферы грамадскага жыцьця, улучна з асьветаю, літаратураю, мастацтвам, — у іхняй інтэгральнай далучанасьці да сусьветнай культуры і, зазвычай, у сваім непаўторна нацыянальным варыянце.

Але спачатку ўдакладнім тэрміналогію, каб пазьбегнуць сэнсавых аберацыяў.

У наш складаны час, у нашай праблематычна незалежнай дзяржаве, дзе гэтак палярызаваліся прыярытэты, кідаецца ў вочы, прыкладам, амбівалентнасьць панятку *гуманітарны*. Для адных – гэта комплекс гуманітарных дысцыплінаў, бо ж – *humanitas* — гэта катэгорыя культуры, асьветы, духовасьці. Для іншых слова *гуманітарны* асацыюецца найперш з гуманітарнаю дапамогаю. Як для мяне, гэта вельмі прык-

ры тэрміналагічны зьбег, які часам прыводзіць да непаразуменьняў, калі замест вытвару канцэпцыі гуманітарнай палітыкі ў яе кардынальных асьпектах усё зводзіцца да размовы пра чарговы гуманітарны груз альбо пра экалагічна чыстыя локшыны.

Думаю, што ў краінах Еўропы, дзе моцная традыцыя гуманізму, больш акрэсьлена разьмежаваныя гэтыя паняткі: *гуманітарны* і *гуманістычны*, *чалавечы* і *чалавечны*, у нас жа ў азначэньні гуманітарных навукаў і гуманітарнае дапамогі гэтая розьніца сьцерлася. Але трэба мець на ўвазе гэты нюанс.

*Аўра*. У слоўніках савецкага перыяду, энцыклапедычных, філасофскіх, нават іншамоўных, — а слоўнікі тыя аселі на кніжных паліцах, і людзі дагэтуль карыстаюцца імі, — *аўра* адназначна інтэрпрэтуецца як тэрмін медычны, з галіны сімптаматыкі некаторых цяжкіх захворваньняў, як сьпецыфічны стан, што папярэднічае наступу хваробы. Гэта, відавочна, ад нелюбові да акультных навукаў, дзе за аўру ўважаецца невядомае сьвячэньне, якім аточаныя матэрыяльныя целы, асабліва чалавек, і якое дадзена ўбачыць хіба што сэнсітывам ды празорцам. Аўру вывучалі яшчэ ў 20-я гады з дапамогаю сьвятлафільтраў, тады ж у Лондане выйшла кніжка Вальтэра Кільнера “Аўра чалавека”. А ў 60-я пайшла нават чутка, што аўру пачалі дасьледаваць амерыканскія навукоўцы, але калі выявілася, што над галовамі некаторых палітыкаў аўра вельмі цёмная і плямістая, досьледы былі прыпыненыя, а іхнія вынікі засакрэчаныя. Даводзілася бачыць і фотаздымак жонкі Рэрыха, на якім яе галава аточаная загадкавым зьзяньнем, — але не бяруся сказаць, ці гэта сапраўды была аўра ці нешта з галіны фотаэфектаў. У кожным разе гэткія эзатэрычныя паняткі, як *аўра* ці, скажам, біяполе, былі супрацьпаказаныя матэрыялізму, пра што і сьведчыць звужанае аказіянальнае вызначэньне аўры ў вышэйзгаданых слоўніках.

Аднак існуе этымалогія слова, дастаткова зьвярнуцца да лаціны, — *аўра* мае там да дзясятку азначэньняў. І ўсе яны зьвязаныя з ветрыкам, павевам, альбо золатам, адценьнямі залатога. Вядомае “aurea mediocritas” Гарацыя – “залатая сярэдзіна”, ці эпітэт Персея “auri gena“ — “золатанароджаны”, то бок сын Данаі ад Юпітэра, які наведаў яе ў выглядзе залатога дажджу.

Зрэшты, aureolus, *арэол*, — гэта ўжо наўпросты продак аўры, хоць у дарозе ад даўняй лаціны да нашых дзён яна абрастала яшчэ і іншымі сэнсамі, як гэта пачасту бывае. Да прыкладу, *камікадзэ* азначае *боскі вецер*, з часам гэтак пачалі называць японскіх лётнікаў-сьмяротнікаў. Але, калі ўдумацца, то нейкае няўлоўнае злучво паміж гэтымі паняткамі ёсьць, бо толькі парыў боскага ветру можа кінуць чалавека на гэткі адчайны крок. Словам, як існуе, бясспрэчна, нейкае біяполе асобы, так існуе і аўра цэлае нацыі, хоць няўзброеным вокам яе не відно.

Што да панятку *нацыя*, то толькі на першы погляд здаецца, што гэта акрэсьлены і ўсім зразумелы панятак. У сам гэты панятак апошнім часам, ужо ва ўмовах, здавалася б, незалежнай Украіны, унесена столькі блытаніны, што зьняверыны грамадзянін можа дарэшты разгубіцца, начытаўшыся нашага друку, дзе ўкраінцаў то прапануюць лічыць этнасам, што пакуль не адбыўся як нацыя, то ажно палітычнаю нацыяй, што зьмяшчае ў сабе ўвесь наш поліэтнічны кангламерат, то народам Украіны, то, як у Канстытуцыі сказана, — украінскім народам. У пашпарце графа “нацыянальнасьць” скасаваная. Эпітэтам *нацыянальны* раскідаюцца так бяздумна, што часам ён губляе контуры сэнсу.

Праблема тут нават не ў ідэнтыфікацыі нацыі, а ў *крызісе самаідэнтыфікацыі нацыянальна дэзарыентаванай часткі грамадства*. Ня буду заглыбляцца ў тэорыю пытаньня, гэта асаблівая тэма, скажу толькі відавочную рэч: калі б украінцы не былі нацыяй, то яны даўно ўжо былі б не ўкраінцы. Аднак жа, быў якісьці боскі вецер, што кідаў пакаленьне за пакаленьнем на барацьбу за гэты народ, за гэты шматок зямлі, які Бог на планеце падараваў украінцам.

І яшчэ адно, ужо не з галіны тэрміналогіі. Калі мы чуем: Гішпанія, гішпанцы, —

якія гэта ў нас выклікае асацыяцыі? Ну, звычайна, Лопэ дэ Вэга, Кальдэрон, Сэрвантэс, Гойя, музей Прадо, Федэрыка Гарсія Лорка.

Але ж дазвольце, а вогнішчы інквізіцыі, а Тарквэмада, а канкістадоры, а выгнаньне габрэяў з Гішпаніі, а дыктатура генерала Франко? Гэта ж таксама Гішпанія. Але чаму вобраз нацыі вызначаецца ня гэтым? Чаму дамінуе літаратура, культура, мастацтва? Мы ведаем паэзію Хімэнэса. Мы ведаем палотны Эль Грэка. Мы ведаем музыку Сарасатэ. Вось што стварае аўру нацыі. Прычым такую, што француз Бізэ піша оперу пра гішпанскую цыганку паводле навэлы француза Мэрымэ. Амэрыканец Хэмінгуэй піша “Фіесту”.

Альбо немцы. Нацыя філосафаў і кампазітараў, хіба ж ня так? Хто даў сьвету Бетховена, Гётэ, Шылера, Гегеля, Канта, Ніцшэ? І хоць Бухенвальд недалёка ад дуба Гётэ, і дуб той сьпілаваны, і жаўнеры вермахту адчынялі на яго пні бляшанкі, — усё адно, ня Гітлер вызначае вобраз нацыі з яго Гебельсам, што хапаўся за пісталет пры слове культура, і ня Эльза Кох, а доктар Фаўст і Лёрэляй над Рэйнам.

Тая ж Расея з яе вечнымі смутамі, з напаўзвар’яцелымі царамі і генсекамі, з яе цёмным, забітым народам, — “где народ, там и стон”, “Россия, нищая Россия”, “Царь, да Сибирь, да Ермак, да тюрьма”, “вольному сердцу пошто твоя тьма?” Аднак жа, ня цемра вызначае ў сьвеце яе гуманітарную аўру. Сьвет добра ведае, што гэтая дзяржава небясьпечная, антыгуманная, але яна мае свой імідж, таму што ў яе былі выдатныя навукоўцы і мысьляры, пісьменьнікі і кампазітары. Бо хоць дзекабрыстаў і запраторылі ў Сібір, хоць расейскія паэты страляліся і вешаліся, хоць Талстому абвесьцілі анафему, а Сахарава высылалі ў Ніжні Ноўгарад, — менавіта яны стварылі аўру нацыі, а не яе дзікія і падступныя кіраўнікі.

Яшчэ Гельвецый заўважыў гэтую паратоўную ўласьцівасьць чалавецтва. “Імя Канфуцыя, — пісаў ён, — больш вядомае і шанаванае ў Еўропе, чым імя якоганебудзь кітайскага імператара”. Яшчэ ў антычным сьвеце ведалі гэтую сілу мастацтва і навукі. І найразумнейшыя з тагачасных дзяржаўных мужоў дбалі ня толькі пра свой палітычны аўтарытэт, а і пра сваё, так бы мовіць, культурна-палітычнае рэнамэ. Яны ведалі, што менавіта літаратура і мастацтва могуць падараваць несьмяротнасьць, бо трываюць у часе. Гуманісты распрацавалі ідэю *гістарычнай несьмяротнасьці*. Дзе тыя даўнія грэкі, дзе рымляне, а гістарычная несьмяротнасьць ім гарантаваная на тысячагодзьдзі.

Над Скандынаўскай паўвыспай, як паўночнае зьзяньне, стаіць чароўная аўра музыкі Грыга, Сібеліюса, чарадзейных казак Андэрсена. На іншым кантыненьце маленькая Калумбія падсьветленая магічнаю аўраю Маркеса. Ці ж трэба казаць, што Ангельшчына – гэта Шэксьпір, Байран, Шэлі? Што Францыя – гэта Вальтэр, Бальзак, Русо, Апалінэр? Што Італія – гэта нацыя Дантэ і Пятраркі, Рафаэля і Мікеланджэла. Бо не квадратны ж падбародак дучэ вызначае яе аблічча, а мастакі і паэты.

А чаму праз гэткія самыя дыёптрыі не зірнуць на Украіну? Калі дзесьці ў сьвеце чуюць – *Украіна, украінцы*, якія гэта асацыяцыі выклікае там? Хіба гэта не заканамернае пытаньне? Мы ўжо дзяржава. То ці ня час задумацца, *хто мы ў вачах сьвету і якую маем аўру*, а калі ня маем, то чаму?

Такім чынам, скарэктаваўшы тэрміналогію і некамфортным пытаньнем паставіўшы сябе ў гуманітарны кантэкст сьвету, мы можам на гэтым закончыць прадмову, датрымаўшыся наказаў аднаго з рэктараў Кіева-Магілянскай акадэміі Іянікія Галятоўскага, ці ня першага тэарэтыка эстэтыкі пропаведзяў, які лічыў, што кожнае казаньне павінна складацца з трох частак: *экзордыюму*, *нарацыі* ды *канклюзіі*. Вось жа, пяройдзем ад *экзордыюму*, то бок уступу, да *нарацыі*, то бок выкладу самой праблемы.

І тут я павінна нагадаць падзагаловак гэтай лекцыі. Цалкам, з падзагалоўкам, яе назва выглядае так: ГУМАНІТАРНАЯ АЎРА НАЦЫІ, альбо ДЭФЕКТ ГАЛОЎНАГА ЛЮСТЭРКА.

Рэч у тым, што калі амерыканцы ў свой час запускалі з мысу Канавэрал дасьледчую станцыю з якімсьці асабліва магутным тэлескопам, што меў надзвычай дакладную сістэму люстэркаў, то, выявіўшы ў апошні момант дэфект галоўнага люстэрка, прыпынілі запуск, выправілі дэфект і толькі тады запусьцілі той тэлескоп на арбіту.

У пераносным значэньні такім тэлескопам, з такою сістэмаю люстэркаў у кожнай нацыі, у кожным грамадстве павінен быць увесь комплекс гуманітарных навукаў, з літаратураю, асьветаю, мастацтвам, — і ў складаным сьпектры тых люстэркаў і люстраных адбіткаў грамадства можа мець аб'ектыўную выяву самога сябе і даваць у сьвет няскрыўленую інфармацыю пра сябе, сфакусаваную ў галоўным люстэрку. Эфект галоўнага люстэрка, дакладнасьць ягонай оптыкі маюць вырашальную ролю.

У нас жа той тэлескоп даўно састарэў, ніколі не мадэрнізуецца, ягоная абслуга часам ня дужа і дасьведчаная, а часам і нядобрасумленная, так што нацыя адбіваецца не ў сістэме разумна наладжаных люстэркаў, факусуецца не ў галоўным люстэрку, а ў шкельцах некарэктна настаўленых лінзаў і прызмаў, якія скрыўляюць выяву да непазнавальнасьці. Маем не эффект, а дэфект галоўнага люстэрка, месцамі яно разьбітае, аскепкі раскіданыя скрозь па сьвеце. Ды ўрэшце гэты тэлескоп зладжаны нам ня намі. Запраграмаваны на сістэму анахранічных уяўленьняў, ён наўмысна скрыўляе аблічча нацыі. Вось так і жывем ва ўвесьчасным адчуваньні няўдачніцтва, псіхалагічнага дыскамфорту, перакручанай праўды. У той час, калі спраўная дасьледчая станцыя з магутным нашым тэлескопам ўжо даўно павінна пралятаць над сьветам, вывучаць сьвет аб'ектыўна, і аб'ектыўна ж адлюстроўваць нас перад сьветам.

Раней гэта было немагчыма. Мы былі ў складзе імперыі, яна прадукавала свой імідж на экспарт, карэктавала сістэму ідэалагічных люстэркаў, стварала ілюзію сваёй, нібыта і нашай, прысутнасьці ў сьвеце. Насамрэч жа мы былі на сусьветнай сцэне толькі па гэты бок жалезнае заслоны. Кадзілі ў ідэалагічнай рыторыцы, самі сабе пляскалі, не бракавала і запэўняньняў, што мы вялікі народ, носьбіты перадавых ідэалаў, што ў нас сусьветна вядомы Шаўчэнка. Уадначас адбываўся нечуваны цынічны генацыд нацыі шляхам рэпрэсіяў, галадамораў ды асіміляцыі, пасьлядоўная яе дыскрэдытацыя ў вачах народанасельніцтва, індэксаваньня ўчэпістых ідэалагемаў накшталт "нацыяналісты", "сепаратысты", "здраднікі". І ўсё гэта ў асьляпляльных перакрыжаваных праменьнях добра адшліфаваных імперскіх лінзаў.

Калі ж з грукатам упала жалезная заслона, выявілася, што па той бок заслоны нас няма. Украіну мала хто ведае, яе ўсё яшчэ блытаюць з Расеяй, яе праблемы для сьвету неактуальныя, за ёю цягнецца шлейф гістарычных заблытанасьцяў, не разьвязаных намі й дагэтуль.

Для шмат каго гэта было страшным адкрыцьцём, для кагосьці прыкраю неспадзяванкаю, а сёй-той літаральна перажыў шок. А найбольш гэта цяжка было, думаю, для маладых амбітных людзей, што акурат уваходзілі ў жыцьцё, не абцяжараныя ні ношкаю рэтрасьпекцыяў, ні нацыянальнымі комплексамі, гатовыя годна жыць і працаваць. А тут раптам такая прыгнятальная і прынізьлівая рэальнасьць.

Выявілася, што нідзе ва ўніверсітэтах сьвету няма ўкраінскіх кафедраў, усё ўспрымаецца праз прызму русістыкі, што ў дыяспары моладзь украінскага паходжання абараняе дактараты па расейскай літаратуры, бо іначай мецьме праблемы з працаўладкаваньнем, што ўкраінскія навуковыя і культурныя інстытуцыі – гэта такія капсулы ўкраінства ў псіхалагічна дыстанцыяваным асяроддзі, без стабільных кантактаў са значна больш прэстыжнымі інстытуцыямі іншых дыяспараў. Што негатыўныя імпульсы адносна ўкраінскай культуры пусьцілі глыбокае і разгалінаванае па сьвеце карэньне. І што стаўленьне да ўкраінцаў як да нацыі

дужа спецыфічнае, часта закамуфляванае да таго, што самі яго носьбіты нават не ўсьведамляюць сваёй шавіністычнай інфікаванасьці.

Што павінна была адразу зрабіць Украіна? Насамперш – аб’ектыўна ацаніць сітуацыю. Паставіць сваю оптыку, сваю сістэму люстэркаў. Распрацаваць сваю гуманітарную палітыку, яе стратэгію ды прыярытэты. Зафіксаваць сябе ў сьвядомасьці чалавецтва парадоксам маладой дзяржавы з тысячагадоваю культураю, што была дагэтуль заблакаваная па гістарычных прычынах. Быць адкрыцьцём для сьвету, а не маральна змарнелым народам у аберацыях чужых люстраных адбіткаў.

Перш за ўсё трэба было ведаць, што ў Расеі галоўнае імперскае люстэрка пастаўленае дакладна, праціраецца да бляску рэгулярна, і механізмы сістэмы востранакіраваных антэнаў акуратна адрэгуляваныя. І ставіць на скорую руку свае сяк-так змантаваныя рэфрактары, то бок тэлескопы, што ловяць сьвятло мінімальнай колькасьцю лінзаў, неразумна і неэфектыўна. Тым больш, калі гэта робіцца з прастадушнаю “дакладнасьцю да наадварот”, паводле прынцыпу – не “Россия родина слонов”, а мы – бацькаўшчына індыкоў.

Эфектыўнае ня тое, што запярэчвае чужому, а тое, што сьцьвярджае сваё.

Замест гэтага ў нас пайшлі па інерцыі. Прынялі дабрадушна трапную формулу Л. Краўчука: “Маем тое, што маем”, і не зрабілі рашучай спробы зьмяніць сітуацыю. Больш за тое, яшчэ і пагоршылі яе за апошнія гады. Не супрацьпаставіўшы дэзінфармацыі пра Украіну магутнай гуманітарнай думкі, распачалі ўваходжаньне ў Еўропу з абярэмкам анахранічных праблемаў. Знайшліся “будзіцелі”, якія ўчынілі вялікі шум і вытварылі дабрэнны такі мультыплакат – нацыю, што сьпіць, стоячы на каленях. Альбо двух украінцаў, з якіх неадменна вегетуюцца тры гетманы. Стала ледзь ня правілам добрага тону сказануць штосьці няўхвальнае пра менталітэт цэлай нацыі. Разгуляліся некіроўныя стыхіі ўзаемных абвінавачваньняў, дражлівыя рэфлексіі адносна гісторыі Украіны ды яе выдатных дзеячаў. Невядома з якога нафталіну выдабылі комплекс няпоўнавартаснасьці.

Нацыя выявілася неабароненаю. Арэол, аўра – гэта вельмі тонкая матэрыя, гэта ня панцыр і ня шчыт, а, зрэшты, нацыі, якія маюць аўру, прыдбаную за стагодзьдзі, абароненыя больш надзейна. Пры гэтым, заўважана, што імперыі заўжды хварэюць на манію велічы. А народы паняволеныя схільныя да самабічаваньня.

Скажам, тая ж Расея. Яна раз і назаўсёды вызначылася для сябе ў арэоле сваёй велічы. І хоць бы якая найдакладнейшая оптыка адлюстроўвала заняпад, нэндзу, дэградацыю, — усё адно, у галоўным люстэрку факусуецца веліч. Хоць усе ведаюць, што гэта зусім і не люстэрка. А даўно ўжо намаляваны свой жаданы вобраз. Фактычна гэта міфалагема на экспарт. Але бяз гэтай міфалагемы Расея сябе не ўяўляе. Толькі на фактажы сваіх рэаліяў яна адчувала б вялікі дыскамфорт. А гэтая міфалагема кампліментарная. Яна лёгка ўваходзіць у сьвядомасьць. Яна ўліваецца ў сістэму грамадскіх навук і стымулюе іншыя міфалагемы накшталт “старэйшы брат” ці “калыска братніх народаў”, з якое вываліліся трое блізьнятаў, спаміж іх адзін чамусьці дужа старэйшы, і якраз той, што зьявіўся на сьвет першым.

Само па сабе імперскае самазахапленьне – зьявішча досыць непрывабнае для навакольнага сьвету, тыпалогія яго сумнавядомая, але яно сілкуе амбіцыі затурканых грамадзянаў, яно для іх паратоўны пояс, які не дае ім патануць у сваім жа балоце. “Россия обречена на величие” – гэта тая аксіёма, якая ў іхняй ментальнасьці чамусьці цалкам ужываецца з іншаю агульнавядомаю формулай: “Нация рабов, сверху донизу все рабы”. Калісьці ня вельмі прыстойны паэт Баркоў у прыступе самадзяржаўнай патэтыкі напісаў: “Россия, встань и оживляйся!” З часам гэты канструктыўны заклік трансфармаваўся ў “Россия, встань и *возвышайся!*”, і фігуруе сёньня на ўсіх нацыянал-патрыятычных зборках. Згадзіцеся, што такі градус самаўзьвялічваньня больш прывабны, чым увесьчасныя заклікі падняцца з каленяў, якія ўжо зрабіліся лейтматывам нашай незалежнасьці. У газетах зьяўля-

юцца ледзь ня рубрыкі: “Хто нас узьніме з каленяў?” – А ніхто. Нацыя на каленях – гэта ня дужа сімпатычны сілуэт. Ёй могуць кінуць адзін-другі крэдыт ды і махнуць на яе рукою. Таму што ніхто нікога не абавязаны ўзьнімаць з каленяў. Апрача таго, хто гэта вызначыў, што мы стаім на каленях? Можа, хто і стаіць, няхай працягвае, ён звык, яму так больш зручна. Вось і нядаўна ў адной са сталічных газетаў зьявілася абнадзейлівае паведамленьне: “Узьнімаемся з каленяў”. Але чаму так настойліва прышчапляецца сама гэтая канфігурацыя? А калі хто не стаяў на каленях, чаго ён павінен узьнімацца? Прыкладам, моладзь, — яна ж папросту яшчэ і не пасьпела пастаяць на каленях, навошта ж ёй прыпісваць такую анахранічную мадэль?

Складваецца ўражаньне, што дакамплектоўвалася наша оптыка па інерцыі адтуль, з колішняй метраполіі. І гэта ня дзіўна, бо больш за трыста гадоў узьяднаньня, нават не прыяднаньня, а паводле прынцыповага пастулату Расеі – *узьяднаньня*, то бок усепранікальнай дыфузіі, — не маглі ня даць сваіх нашчадкаў. Той жа патэтычны заклік: “Россия, встань и возвышайся!”, — мае на ўвазе, між іншым, таксама ўставаньне з якойсьці непрэзентабельнай пазіцыі. А што ўжо казаць пра пагрозьлівую інвектыву новага расейскага прэм’ер-міністра, якая нядаўна прагрымела ў расейскай прэсе: “Россия может встать с колен и как следует огреть”. Розьніца толькі ў тым, што Украіна нікога не зьбіраецца “огреть” і адным са сваіх найбольшых дасягненьняў уважае спакой і лагоду, што пануе ў нашым грамадстве. Аднак патрыёты запэўніваюць, што нацыя сьпіць. Гэта ў нас другі лейтматыў незалежнасьці.

Што да прыроды гэтага сну, то ў мяне ёсьць сумнеў. Я яго сфармулявала яшчэ некалькі гадоў таму перад украінскаю аўдыторыяй у Канадзе: “Сон, непрытомнасьць ці летаргія?” і мела ўражаньне, што такую карэктыву да санлівасьці нацыі аўдыторыя ня дужа ўспрыняла. А нядаўна я знайшла пацьверджаньне ў Гельвецыя. Яшчэ ў XVIII стагоддзі гэты філосаф пісаў пра *летаргію* народаў, што выйшлі з-пад дэспатыі. Больш за тое, ён заўважыў, што ў такіх краінах “летаргія прымаецца за спакой”. Ці не пра тое ж самае ў Зэрава: “Де розум і чуття – все спіть в анабіозі”? Вось жа не пра сон гаворыцца, а пра летаргію, у лепшым выпадку пра анабіёз, гэта станы хвараблівыя і могуць закончыцца для нацыі фатальна. Гэтак нядоўга дайсьці і да аўры ў інтэрпрэтацыі савецкіх слоўнікаў.

Яшчэ адзін лейтматыў – рэфлексіі адносна брому, без якога нібыта немагчыма чытаць нашу гісторыю. Сказаныя калісьці пад гарачую руку, гэтыя словы Віньнічэнкі паўтараюцца і тыражуюцца, і заганяюць суайчыньнікаў у комплекс далучанасьці да эксклюзіўных жахаў нашай гісторыі.

А якую гісторыю можна чытаць бяз брому? І ўвогуле, навошта гісторыю чытаць з бромам? Гісторыя – справа даўняя, яна даўно мінулася. Глядзіце трансьляцыі пасяджэньняў нашага парламенту, тут і бром не дапаможа.

Ды й чым, уласна, наша гісторыя горшая, чым у іншых народаў? Што, гісторыю Ангельшчыны можна чытаць бяз брому? Калі каралева Марыя Каталіцкая, так і называная Крываваю, карала сьмерцю пратэстантаў? Калі ў часы Шэксьпіра “кроў з эшафотаў пырскала на сцэну”? Нездарма ж у сьпектаклі грузінскага рэжысёра Стуруа “Рычард III” героі ходзяць па сцэне ў плашчах, падшытых крывёю.

Ці гісторыя Францыі, з яе Варфаламееўскаю ноччу, з крывавым тэрмідорам? Ці даўні Рым з яго гладыятарамі, з яго цыркам, дзе ільвы на арэне разьдзіралі хрысьціянаў? Ці, можа, гісторыя Нямеччыны дае ўзоры ідылічнага развою нацыі? Ці, можа, у Італіі Дантэ ня быў выгнанцам, а Тарквата Таса ня стаў бажавольным? Ці Расея ня зьнішчыла мільёны людзей у ліхаманцы сваіх перманентных экспансіяў? А каланіяльная палітыка Гішпаніі ці Партугаліі? А за адзін год у Таледа тры тысячы працэсаў супраць “ерэтыкаў”? А трыццацігадовая вайна ў Еўропе, яна толькі пасьпела закончыцца, калі пачалася наша нацыянальна-выз-

вольная пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Еўропа ляжала ў руінах, сабакі вылі на папялішчах.

Кожнай нацыі ёсьць за што пасыпаць сваю галаву попелам. Толькі ня трэба тым попелам зацярушваць вочы наступным пакаленьням. Ніхто з нас ня можа несьці адказнасьць за даўнія неапраўданыя грахі. Але кожны з нас абавязаны іх не паўтарыць і не прымножыць.

Каэфіцыент шкодніцтва ўсіх гэтых заклікаў – узьняцца з каленяў, прачнуцца, чытаць гісторыю з бромам і г.д. проста ўжо катастрафічны. Што гэта, псіхоз навязлівай маніі, пост-каланіяльны сіндром ці проста элементарная неасьвечанасьць?

У нас ёсьць выдатныя навукоўцы, адмыслоўцы ў розных галінах ведаў, але чамусьці прыслухоўваюцца не да іх, іхнія постаці адсутнічаюць у галоўным люстэрку нацыі, затое бесьперапынна мігцяць фальшывыя зоркі шоў-бізнесу альбо палітыкі ўсіх колераў і калібраў, якія выстрэльваюць у масы сумнеўныя лозунгі і сентэнцыі накшталт "нацыянальная ідэя не спрацавала", "так гістарычна склалася", "наш народ не падрыхтаваны", "другая дзяржаўная мова" і г.д. Уражаньне такое, што таго люстэрка ўвогуле няма. На яго месцы нуль. Дзірка, затканая павутою. Нават не дэфект галоўнага люстэрка, а яго адсутнасьць.

Чаго вартыя, прыкладам, увесьчасныя заклінаньні культуры эканомікаю, — гэта ўжо лейтматыў з вышэйшых эшалонаў улады, — маўляў, адродзім эканоміку, тады і пачнецца духоўнае адраджэньне. І росквіт культуры, і літаратуры, і мастацтва. Такога ніколі не было, гэта абсалютная няпраўда, і доказ гэтаму – уся гісторыя сусьветнай культуры. У эпоху Адраджэньня і войны былі, і ліхалецьце, і скульптуру Мікеляндэжла чэрнь скідала на брук. Гішпанія часоў Сэрвантэса таксама была ў заняпадзе. Вазьміце "Сусьветную гісторыю", выданьне Каспары, 1903 г., С.-Пецярбург. Там ёсьць разьдзел, які літарарльна так і называецца: "Эканамічны заняпад і культурнае ўзвышэньне Гішпаніі". Бо эканоміку развальваюць адны, а культуру ствараюць іншыя. Гішпанія тых часоў была дашчэнту разбураная. Там таксама былі высокія падаткі, інфляцыя, эмісія, працьвітала тое, што мы цяпер называем карупцыяй. Двор купаўся ў раскошы, дзяржава грузла ў пазыках. Усе тыя гранды і кабальера былі як нашы дэпутаты. "Палі зарасталі бур'янамі,— цытую. – Так пачала гінуць Гішпанія". І пры гэтым быў "росквіт духовага жыцьця", "мастацтва і паэзія дасягнулі найвышэйшага развою", у краіне ствараліся шматлікія паэтычныя акадэміі. Сервантэс і яго сучасьнік з суседняй Партугаліі Камоэнс, удзельнікі якіхсьці тагачасных "гарачых кропак", адзін страціў руку, а другі – вока, абодва жылі ў нястачы, ня мелі ад урадаў ніякіх ільготаў, аднак адзін напісаў "Дон Кіхота", а другі – свае "Лузіяды", якія ёсьць і па сёньня акрасаю партугальскай літаратуры.

Альбо та я ж Расея, "нишчая" і "немытая", у паэтаў якой была "бледная, в крови, кнутом иссеченная Муза", — а якую паэзію дала тая Муза, так і не дачакаўшыся больш спрыяльнага для сябе перыяду. І Залаты век у яе быў, і Срэбны. І менавіта ў найцяжэйшыя перыяды гісторыі, пад нядрэмным вокам цэнзуры, у катаклізмах пачатку стагодзьдзя, то расстраляная, то рэпрэсаваная, то асуджаная на эміграцыю.

Блюзьнерствам будзе гаварыць пра тое, што духовае жыцьцё залежыць ад эканомікі і дабрабыту, калі перад вачыма лёсы закатаваных, перасьледаваных, рэпрэсаваных украінскіх пісьменьнікаў. Чамусьці ў гістарычную несьмяротнасьць увайшлі менавіта яны, а ня тыя, што раскашавалі пры ўсіх рэжымах. Так што ўсё гэта – злыдзенства духу, папулісцкія дурніцы, той самы дэфект галоўнага люстэрка.

Але чаму людзі ім вераць, чаму ня робяць сабе клопату падумаць, чаму зноў і зноў даюць сябе ашукаць? Я назвала б гэта – адаптаваным розумам. У Ніцшэ ёсьць панятак – *розум зьвязьнены, паняволены.* Дастасоўна да ўкраінскай сітуацыі гэта хутчэй розум *адаптаваны.* Магчыма, гэта нават горш, чым зьвязьнены, бо зьвязьнены яшчэ можа неяк устрапянуцца і ўдарыць крыламі аб краты, а адаптаваны ўжо зблякнуў, прызвычаіўся, страціў сваю энергетыку. Мабыць, гэта яна і

ёсьць, тая “летаргічная млявасьць, што ахапляе ўсіх чальцоў такога народу”, як пісаў Гельвецый.

З тае ж оперы і заклінаньні, прыкладам, пра тое, што абіраючы мэра, ці прэзідэнта, ці дэпутатаў, ты абіраеш свой лёс. Што галоўнае – еднасьць, без удакладненьня каго і з кім. Што там, дзесьці далёка за мяжой, у нас “шматвектарная зьнешняя палітыка”. Як быццам нутраная мела хоць які пераканальны вектар.

Літаральна на вачах адбываецца барбарызацыя грамадства, што асабліва небясьпечна для нацыяў, якія не прайшлі яшчэ сваіх прэстыжных стадыяў, якія ў рэцэпцыях сьвету яшчэ ня маюць духовай аўры і раптам атрымалі доступ да сусьветнай культуры ў яе плябейскай транскрыпцыі. У рэкламах з выкарыстаньнем сусьветных шэдэўраў, у назвах крамаў і фірмаў. Рыбкі Мацiса, што плаваюць. Джаконда, што падміргвае. Жанчына Мадыльяні, што яшчэ больш выцягвае шыю. Абутковая фірма называецца “Дон Кіхот”, крама сантэхнікі – “Кармэн”. Кампутарны вірус, і той “Мікеланджэла”. Зрэшты, апошні прыйшоў з Захаду.

Арганічная неабходнасьць у культуры атрафуецца.

Не дадае Украіне прэстыжу і мова яе грамадзянаў ды палітыкаў. Пра гэта будзе сказана асобна. А цяпер толькі зазначу, што старажытныя грэкі тых, хто кепска размаўляў па-грэцку, лічылі барбарамі. У гэтым сэнсе ў нас грамадства амаль суцэльна барбарскае. Ні сапраўднае ўкраінскае мовы, ні расейскае. То якое *другое дзяржаўнае* прагнуць гэтак званыя “расейскамоўныя”? Ці вядома ім, што іхнюю “другую дзяржаўную” ў заходніх навуковых выданьнях ужо афіцыйна называюць *суржыкам*?

Зьява вымагала тэрміну, і яна яго атрымала.

Сапраўды, “так гістарычна склалася”. Нечуваны ўціск русіфікацыі прывёў да паталагічных мутацыяў. Вось жа патрэбная не апалогія тых мутацыяў, а іхняя дыягностыка і лекаваньне. Мова – гэта таксама аблічча народу, яно цяжка ствараецца.

У такой сітуацыі асабліва дзяржава павінна мець глыбока прадуманую гуманітарную палітыку. Ствараць механізмы эфектыўнага ўплыву, каардынаваць высілкі сваіх навукоўцаў і мастакоў. Бо пры такіх дэструкцыях, у пераходны перыяд, гэта жыцьцёва неабходна – накрэсьліць шляхотныя абрысы сваёй культуры.

А тым часам людзям галовы засьмечваюць мэтлахамі. З друку, радыё, тэлебачаньня сыплецца філалагічна і маральна непрасеяная прадукцыя. А якіясьці канкрэтна ўшляхотненыя паасобныя зьявы – гэта вынік чыста індывідуальных высілкаў як заўжды этычна арыентаваных інтэлігентаў.

Бясспрэчна, патрэбны тэлескоп без дэфектаў усяго за восем гадоў дзяржаўнасьці стварыць цяжка. Гэта вельмі складаная сістэма люстэркаў. Але ж, прынамсі, можна было б ужо мець хоць якісьці праект. А то яшчэ за савецкім часам як была настаўленая оптыка на прымітыў, так яна і засталася.

Ды яшчэ цяпер і час такі настаў, што кожны можа пускаць “зайчыкаў” са свайго балкону. Кожны можа глядзець у перавернуты бінокль. Кожны можа ўсё разглядаць праз сваю прызму. Закамплексаваная феміністка, зірнуўшы на сябе ў сваё дамскае люстэрачка, можа заявіць: “Літаратуры ў нас няма”. Хіба што архаічныя скiвіцы могуць пераважаваць у друку нясьцерпнае для слыху слова “жыд”. Дзяржаўны дзеяч калгаснага тыпу можа прылюдна з трыбуны настальгаваць па калысцы братніх народаў.

Яшчэ адзін кантрапункт незалежнасьці: навязьлівая ідэя, завезеная нам амбітнымі аўтсайдэрамі заходняй навукі, — *дэсакралізацыя*. І не каго другога, а менавіта Шаўчэнкі. Ужо ў нашай літаратуры няма больш-менш прыкметнае постаці, якая не была б аблітая брудам.

Для дэмакратыі ў гэтым яе пост-таталітарным варыянце характэрная страта шляхотнасьці ў пачуцьцях, у крытэрах, у палеміцы. Ну, няўжо ж гэткім най-

актульнейшым заданьнем інтэлектуалаў было ганяць каламутныя хвалі вакол Шаўчэнкі? Прычым, дыяпазон гэтых змаганьняў уражвае. Адныя – за дэсакралізацыю, другія – за кананізацыю. Галоўнага люстэрка і тут няма.

Яшчэ нашыя класікі ня вернутыя Украіне ў нармальнай цывілізаванай оптыцы, яшчэ тэксталагічна не адноўленыя іхнія творы, пакалечаныя то царскаю, то савецкаю цэнзурай, яшчэ мы іх не вызвалілі з цянётаў фальсіфікацыяў, — а ўжо ўзяліся зьнішчаць.

Асабліва раздражняе сяго-таго, што Шаўчэнка ў вачах украінцаў прарок.

А палякі ў сваім галоўным люстэрку бачаць *Krypte wieszczov* і два надмагільлі: Міцкевіч і Славацкі. *Wieszcz*, між іншым, гэта па-польску *прарок*. І ня проста прарок, а вялікі паэт-прарок.

Калісьці партыйныя ідэолагі разьбівалі вітраж Шаўчэнкі. Цяпер таксама швабраю дастаюць.

Не ўяўляю, каб іншыя народы дапусьціліся да нечага падобнага. Згадайце, як прэзентуюць сваю літаратуру грузіны. Тыя ж старажытныя грэкі забаранялі рабам сьпяваць песьні на словы сваіх паэтаў. Брус Лі, амерыканскі актор кітайскага паходжаньня, ні ў адной са сваіх роляў не дапускаў прыніжэньня кітайскай культуры.

А тут што ні парнаграфічны шабаш, то і этнаграфічныя гапакадзействы.

Гэта ўжо нават ня скрыўленая сістэма люстэркаў, гэта – зламесны пакой сьмеху. Ёсьць там і "хахлы", і запраданцы, і мазепаўцы, і нацыяналісты.

У сваім імперскім люстэрку Расея паказвала Украіну як Маларасею. Яна і да гэтай пары паказвае там розныя скрыўленыя твары.

Але ня трэба біць па ім кулаком, разьбітае люстэрка – дрэнная прыкмета. Трэба проста паставіць сваё, і яно пакажа Украіну зусім у іншым сьвятле. Будзе ў яе заўтра ж аўра, ці ня будзе, але, прынамсі, цені цьмутараканскія разьвеюцца.

Пасьля стагоддзяў такога "ўзьяднаньня" доўга яшчэ нам давядзецца вяртацца да сумных вынікаў. Але ўсё гэта праблемы мінулых асьпірацыяў.

А сёньня зьвярніце ўвагу: Растраповіч, прыехаўшы ў Расею з сімфанічным аркестрам, кажа: "Мы будзем граць расейскую музыку, каб паказаць, які вялікі расейскі народ".

І пакуль тут нашыя пігмеі намагаюцца паваліць нашых волатаў, Расея, як тая царыца з пушкінскай казкі, усё зазірае ў люстэрка, усё ў яго пытае: "Я ль на свете всех милее, всех румяней и белее?" У нас рамантавалі цэнтральную вуліцу сталіцы, і то колькі было нараканьняў, — "заробкі не даюць", а Крашчацік выбрукоўваюць. А Расея рэстаўруе свой Пецяргоф, аднаўляе Бурштынавы пакой. Праўда, пры гэтым яна пагрымвае касьцямі забітай царскай сям'і і бамбардуе Грозны, што ёй аўры не дадае.

Мы нават 800-годдзе Чарнобылю не змаглі адзначыць. Юбілей мёртвага гораду, — дзе яшчэ такое ў сьвеце ёсьць? Гораду слаўнага, старажытнага, атамны попел якога павінен быў стукаць у наша сэрца, — не адзначылі і забылі.

А ў Ніжнім Ноўгарадзе, прыкладам, зьбіраюцца сьвяткаваць "1000-летие русской ложки". Хоць тады там ня толькі расейскай лыжкі, а і саміх расейцаў яшчэ не было, былі мардва і булгары. Нацыя любіць сябе, даточвае там, дзе закоратка. Пакуль украінцы думаюць, што Ганна Яраслаўна, каралева Францыі, — кіеўская княжна, дзесьці ў Яраслаўлі, у глыбіні Расеі, рэстаўруюць нейкі будынак пад гатэль "Анна Франс", адкрываюць помнік Яраславу Мудраму, і прэзідэнт Расеі называе яго "первым русским князем-реформатором". А ўкраінская дэлегацыя за яго сьпіною толькі іранічна ўсьміхаецца.

У часы чарговай смуты манах Філафей сядзеў у нейкім пскоўскім манастыры і шыў Маскве навырост тэорыю "трэцяга Рыму". І хоць ён сябе называў "невежа в премудрости", але добра кеміў, што робіць. Замест таго, каб пісаць, што Масква

ў балоце сядзіць, і маскавіты вялікімі вартасьцямі не адрозьніваюцца, ён ставіў Маскве яе дзяржаўніцкую оптыку. І яна яе добра-такі ўдасканаліла за столькі стагоддзяў. Потым мітрапаліт Макарый пісаў не якую-небудзь, а "царственную книгу". І вынікала генеалагічная легенда пра паходжаньне маскоўскай царскай дынастыі ад "Августа-кесаря", зазвычай, з перасадкаю ў Кіеве, у князя Уладзіміра.

І як бы ні выпручвалася рэальная гісторыя, а расейскія гісторыкі – як ілюзіяністы, яны дастануць тое, чаго там ніколі не ляжала. І гэта будзе "маскоўская схема сусьветнае гісторыі", як пісаў прафесар Аглоблін. І зламаць тую схему вельмі цяжка. А месца для Украіны ў той схеме няма.

А дзе наша ўніверсальна-дзяржаўніцкая тэорыя? Я не заклікаю да траглладыцка-шавіністычных ідэалагемаў, але ж патрэбная канцэптуалізацыя падвалінаў, на якіх мае стаяць дзяржава.

Кутнім каменем такіх падвалінаў у цывілізаваных народаў заўжды была Кніга, культура. Рым перамог Грэцыю мілітарна, але яна яго скарыла культураю, прадоўжыўшы сябе ў антычным інварыянце і падараваўшы яму гістарычную несьмяротнасьць. У эпоху Адраджэньня нават даніну з пераможаных бралі кнігамі.

Вось тут, магчыма, і ёсьць сумная разгадка, чаму Гердэр пісаў: "Славянскія народы займаюць больш месца на зямлі, чым у гісторыі". Гэта ня так. Гісторыя была, гісторыя, годная вялікіх народаў. Але яна не адлюстравана ў сусьветна вядомых аналах. На гэта склалася багата прычынаў, сярод іх і візантыйская адасобленасьць культуры сярод лацінамоўных культураў. Але таксама відавочна і тое, што шаблямі нашы продкі валодалі зграбней, чым пяром. Бо калі Данія мае ў пачатках сваёй гісторыі Саксона Граматыка, што напісаў "Дзеі датчанаў", то з тае пары ёсьць і датчане, і іхнія дзеі, духова не прыўлашчаныя нікім. Гісторык Ёрдан апісаў дзеі готаў. Готаў няма, а дзеі ёсьць.

На пачатку стварэньня сьвету было Слова.

На пачатку стварэньня нацыі таксама павінна быць *Слова.*

Але калі ўжо так сталася, што нашы продкі не выявілі такіх камунікацыйных інтэнцыяў і не пакінулі свайго магутнага люстэрка, то, прынамсі, трэба паглядзець у чужое аб'ектыўна. Французскі гісторык Шэрэр, прыкладам, пісаў пра ўкраінцаў так: "Мы пабачым бацькоў, што перадалі сваім сынам пачуцьці гонару быць незалежнымі і пакідалі ім у спадчыну адну толькі шаблю з дэвізам: "Перамагчы альбо загінуць!" Цалкам іншы вобраз нацыі. Дзе ж тут стаяньне на каленях, дзе хранічны сон, дзе тры гетманы з двух украінцаў? Паўтараю, гэтак бачыў украінцаў француз.

Але ж ён і пісаў: "Тыя вартасьці, што выклікаюць захапленьне, калі гаворыцца пра грэкаў ці рымлянаў, магчыма, лічацца барбарскімі ў расповедах пра казакоў". Так і сталася. Чаму? Зноў жа такі, пытаньне оптыкі і таго галоўнага люстэрка, якое чамусьці не факусуе праўды.

Увогуле ж у люстэрку сусьветных апініяў "нацыянальныя фізіяноміі", як назваў іх Кант, адлюстраваныя больш-менш аб'ектыўна, у суме сваіх антрапалагічных характарыстыкаў і на падставе даміноўных дэфініцыяў духова-гістарычнага кшталту.

Кант у сваёй "Антрапалогіі з прагматычнага гледзішча" зрабіў аглядную характарыстыку розных народаў. У гішпанцаў ён канстатуе "нацыянальную пыху" і ўсьведамленьне ўласнай годнасьці, у немцаў – "тэмперамент халоднай развагі і вытрымкі". Французы, на яго думку, вызначаюцца дабрынёй і вынаходлівым жаданьнем да сумоўя, а італьянцы – мастацкім густам. Пра армянаў піша з вялікай сімпатыяй, як пра народ разумны і працалюбны. Сучасныя грэкі здаюцца яму падупалымі ў параўнаньні з іхнімі вялікімі продкамі, але яшчэ здольнымі да адраджэньня. Што да Расеі, то ён сказаў пра яе даволі ўхіліста, — "Расея яшчэ ня тое, што патрэбна для пэўнага панятку пра прыродныя задаткі, зрыхтаваныя да развою".

Ангельцаў і французаў Кант станоўча называе двума “найцывілізаванейшымі народамі на зямлі” і, апрача прыродных уласьцівасьцяў, адзначае іхні “развой з дапамогаю мовы”. Ня лішне адзначыць, што гісторыя з часоў Канта не аднойчы пацьвярджала слушнасьць ягоных папярэджаньняў.

Украінцы, зразумела, у тых кантаўскіх выкладах не прысутнічаюць. Украіна была ў складзе іншай дзяржавы, і, як складнік, хоць і мела сваю нацыянальную самабытнасьць, самастойна для сьвету не існавала. Толькі ў пэўныя перыяды да яе абуджалася цікавасьць. У перыяд казацкіх войнаў, скажам, калі яна зьявілася як новы фарматворчы элемент гісторыі. З часам зьвярнула на сябе ўвагу нямецкіх рамантыкаў, калі яны адкрылі для сябе паэтыку гэтай славянскай стыхіі. А таксама ў перыяд вызвольных змаганьняў за сваю дзяржаву ў 20-я гады. Ды вось цяпер, калі яна можа паўстаць на поўны рост.

То ці ня час навесьці той кантаўскі аб’ектыў на гэтую нацыю, — няўжо там адлюструецца тая яе фізіяномія, якую так горка намаляваў калісьці Панцеляймон Куліш, — фізіяномія народу “бяз шляху, бяз гонару, без павагі”?

Тады ўсё правільна, тады і Мэрымэ меў рацыю, калі пісаў, што Багдан Хмяльніцкі – вялікі палкаводзец, але ня стаў сусьветна вядомым яшчэ і праз тое, што належаў да цёмнага народу.

Калі ж гэта так, то годзе ўжо дабіваць гэты народ.

Вось ён і настаў, найспрыяльнейшы час народу, і яму наканавана павярнуць яго гісторыю, яго мову, яго культуру. Бо ж усё гэта стагоддзямі нішчыла імперыя — як вызначальныя чыньнікі яго нацыянальнай ідэнтычнасьці.

Замест гэтага сталася недаравальнае, — ужо не імперыя, ня вораг, а ў сваёй жа незалежнай дзяржаве знайшліся сілы з markрознымі мэтамі, але ўадначас скіраваныя на дэмантаж Украіны.

Сказаў Мантэск’ё – спачатку трэба быць кепскім грамадзянінам, каб потым стаць добрым рабом. У нас вельмі шмат кепскіх грамадзянаў. Цяжка збудаваць дзяржаву, у якой нават некаторыя парламентары ня хочуць прымаць прысягу на вернасьць ёй, у прадчуваньні салодкай персьпектывы быць зноў рабамі.

Такія рэчы трэба прыпыняць адразу, такіх дэпутатаў трэба пазбаўляць мандату. Ці ж у Францыі, Ангельшчыне, ЗША штосьці падобнае дазволілі б сабе парламентары? Галоўнае люстэрка іх спапяліла б. У нас жа пануе млявая талерантнасьць, якая выдаецца за дэмакратыю. Украіну больш ведаюць у сьвеце праз спартсменаў і карупцыянераў, чым праз тое, што ёсьць яе сутнасьцю.

Дзяржава – гэта сістэма, якая зьберагае сябе. А калі мы дзяржава, а, значыць, сістэма, то чаму мы дазваляем яе разбураць? Канец XX стагоддзя, пачатак тысячагодзьдзя, — нацыі, якія да гэтай пары не адбыліся, нацыі слабыя і нестабільныя, персьпектывы ня маюць. Сёньня дзейнічаюць іншыя механізмы. Яны жорсткія. Слабыя народы будуць перамеленыя ў гэтым млыне. Нашыя праблемы нікога не цікавяць, і ня трэба думаць, што яны ў нас унікальныя. Мы найлепшыя, нам найгорш, — у гісторыі гэты прынцып не спрацоўвае. Перуанскі пісьменьнік Марыо Варгас Льёса пісаў яшчэ шмат гадоў таму — можа здарыцца так, што “найцяжкую барацьбу мы, лацінаамерыканцы, будзем весьці самі з сабою. Нас абцяжарваюць стагодзьдзі панаваньня нецярпімасьці, абсалютных ісьцінаў і дэспатычных урадаў, і скінуць гэты цяжар будзе нялёгка”. Нібы пра нас.

То, можа, ставіць пытаньне пра гуманітарную аўру Украіны яшчэ несвоечасова, можа, гэта перадчасна і нават па-свойму некарэктна? Украіна яшчэ перабывае ў іншай сістэме каардынатаў. Думаю, што своечасова. Трэба рабіць усё, што можа паскорыць працэс яе апрытомненьня, яе паўнацэннага ўваходжаньня ў сусьветную супольнасьць. Нават калі для гэтага патрэбная шокавая тэрапія.

Карамзін адкрыў Расею, як Калумб Амерыку, — сказаў Пушкін. Дадамо: адкрыў у вялікай меры коштам украінскай гісторыі.

Амерыку Калумб адкрыў, шукаючы Індыю. Доля абарыгенаў вядомая.

Мы ж Украіну адкрываем ва Украіне, і гэта нікому не пагражае стратаю ні тэрыторыі, ні духовых каштоўнасьцяў. Гэта толькі вымагае перагляду звыклай схемы. Перастаноўкі некарэктна настаўленых люстэркаў.

Украінцы – нацыя, якую стагоддзямі выцясьнялі з жыцьця шляхам фізічнага зьнішчэньня, духовай экспрапрыяцыі, генетычных мутацыяў. Мэтанакіраванага перамешваньня народаў на яе тэрыторыі, дзякуючы чаму адбылася амнезія гістарычнай памяці і якасныя страты самога нацыянальнага генатыпу. Вобраз яе ствараўся стагоддзямі, ёй прыпісвалася ледзь не генетычная тупасьць, не адмаўлялася ў мужнасьці, але інкрымінаваўся то нацыяналізм, то антысемітызм. Вялікае дзіва, што гэтая нацыя сёньня яшчэ існуе, яна даўно ўжо магла б зьнівеляваца і зьнікнуць. Фактычна гэта рарытэтная нацыя, самотная на ўласнай зямлі ў сваім вялікім соцыюме, а яшчэ больш самотная ва ўніверсуме чалавецтва. Фантом Еўропы, што толькі пад канец стагоддзя пачаў набываць у вачах сьвету рэальныя абрысы. Яна чакае сваіх філосафаў, гісторыкаў, сацыёлагаў, генетыкаў, пісьменьнікаў, мастакоў. Неўрастэнікаў просяць не турбавацца.

І тут я павінна перайсьці, згодна з Іянікіем Галятоўскім, да *канклюзіі*, то бок да заключнай часткі.

То адкуль ён, гэты *дэфект галоўнага люстэрка*?

Прыгадайце чарадзейную казку Андэрсэна “Сьнежная каралева”. Там усё пачынаецца з таго, што адзін вельмі ліхі чорт зрабіў чароўнае люстэрка. “Гэтае люстэрка, — цытую, — мела незвычайную ўласьцівасьць: усё добрае і прыгожае памяншалася ў ім да немагчымага, а ўсё агіднае і ліхое адбівалася больш акрэсьлена і здавалася яшчэ горшым”.

Гэта і ёсьць – дэфект галоўнага люстэрка. Яго зрабіў чорт. А вучні і пасьлядоўнікі чорта, — цытую далей, — “паўсюль бегалі з тым люстэркам і, нарэшце, не засталося ніводнае краіны, ніводнага чалавека, якія б не адлюстраваліся ў тым люстэрку скрыўленымі”. Тады паплечнікі чорта паляцелі на неба, яшчэ і там хацелі пазабавіцца. Але люстэрка адлюстроўвала такія страхоцьці, вытварала такія грымасы, што ажно выпала з іхніх рук, бразнулася аб зямлю і разьбілася на мільёны аскепкаў. “І тыя аскепкі нарабілі яшчэ большай шкоды, чым само люстэрка.” Яны лёталі скрозь па сьвеце, і калі траплялі каму ў вока, то “чалавек з такім аскепкам у вачах бачыў усё перакручаным, або толькі самае ліхое, бо кожны аскепак меў тую ж сілу, што і цэлае люстэрка. Некаторым людзям аскепак трапляў у сэрца… і сэрца ператваралася ў маленькую сьняжынку… А па сьвеце лётала яшчэ шмат такіх аскепкаў…”

Ня буду расшыфроўваць, што гэта за чорт і хто яго паплечнікі. Sapienti sat. Скажу толькі, што тыя аскепкі лётаюць па сьвеце да гэтай пары, і людзі з такімі аскепкамі ў вачах бачаць зусім ня тую Украіну. Але гэта ўсё рэвербацыі старых імперскіх люстэркаў з аблезлаю ўжо амальгамаю.

На шчасьце, з цягам часу большае людзей, якія ня хочуць, каб такія аскепкі траплялі ім у вочы і ў сэрца.

Вось так гісторыя і трывае. І калі мы ўчора ня выпілі брому, чытаючы яе, то сёньня і заўтра будзем здольныя яе ствараць.

Толькі ня трэба чакаць, каб хтосьці вам зрабіў ваша ўласнае індывідуальнае люстэрка і ўмантаваў у яго сістэму супольных люстэркаў. Кожны павінен зрабіць гэта сам.

Дэмакратыя тым і добрая, што пры дэмакратыі не дзяржава разбурае чалавека, а чалавек будуе дзяржаву. І самога сябе. І сваё годнае жыцьцё, і гуманітарную аўру сваёй нацыі.

Вось у чым “Ключ разуменьня”, як сказаў бы Іянікій Галятоўскі.